беспрацоўе. У Беларусі яна мае невялікія памеры. Дзяржаўная служба занятасці насельніцтва вядзе ўлік свабодных працоўных месцаў, рэгістрацыю беспрацоўных, ажыццяўляе працаўладкаванне і перападрыхтоўку кадраў, выплату дапамог па часовым беспрацоўі.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў 2023 г. склаў 3,5 % ад эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі. На працягу апошніх 10 гадоў ён зніжаецца. Праблемай занятасці насельніцтва з'яўляецца скрытае беспрацоўе. Яно характарызуецца тым, што пэўная доля працаздольнага насельніцтва толькі часткова забяспечана працоўнымі месцамі. Частковая занятасць — магчымасць працаваць сезонна ці няпоўны працоўны дзень.

**Падвядзём вынікі.** Для насельніцтва Беларусі характэрнае перавышэнне долі насельніцтва ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, над дзіцячым насельніцтвам. У насельніцтве краіны пераважаюць жанчыны. Доля працаздольнага насельніцтва ў працоўных рэсурсах перавышае 94 %. Больш за 60 % эканамічна актыўнага насельніцтва занята ў сферы паслуг, каля 40 % — у сферы вытворчасці.

***Праверце сябе.*** 1. У чым заключаюцца асаблівасці ўзроставай структуры насельніцтва Беларусі? 2. Якую інфармацыю можна атрымаць з аналізу полаўзроставай піраміды? 3. Чаму колькасць працоўных рэсурсаў меншая за колькасць асоб працаздольнага ўзросту? 4. Якое насельніцтва адносіцца да эканамічна актыўнага?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Растлумачце, чаму ў наш час павялічваецца доля эканамічна актыўнага насельніцтва, занятага ў сферы паслуг, і як на гэта ўплывае якасны склад працоўных рэсурсаў. 2. Як якасці чалавека могуць гарантаваць канкурэнтаздольнасць на рынку працы? Якія геаграфічныя веды пры гэтым будуць неабходныя?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Па картах атласа (с. 32) вызначце ўзроставую структуру гарадскога і сельскага насельніцтва вашага раёна.

## § 24. Міграцыя насельніцтва. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва

***Успомніце.*** *Што такое міграцыя насельніцтва? Што такое этнас? Назавіце сусветныя рэлігіі.*

**1. Міграцыя насельніцтва.** На змяненне колькасці насельніцтва Беларусі і яе рэгіёнаў таксама ўплывае міграцыя. Міграцыйная актыўнасць у Беларусі павышалася на працягу XX ст.

Унутраная міграцыя ў рэспубліцы пачалася ў выніку індустрыялізацыі ў 1920-я гг. і выявілася ў перасяленні людзей з сельскай мясцовасці ў гарады. Насельніцтва стала канцэнтравацца ў гарадах. Для іх таксама характэрная маятнікавая міграцыя.

На мяжы 1980–1990-х гг. на змяненне міграцыйных патокаў паўплывалі распад СССР і катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.

На пачатку XXI ст. намеціліся новыя тэндэнцыі змены міграцыйных патокаў. Аб'ём унутранай міграцыі павялічваецца і на 2019 г. склаў 240,4 тыс. чал. Працягваецца міграцыя насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады і пасёлкі гарадскога тыпу. Міграцыйны прырост гарадскога насельніцтва ў 2019 г. склаў каля 10 тыс. чал. Напрамак унутранай міграцыі залежыць ад блізкасці тэрыторыі да сталічнага рэгіёна, прамысловых цэнтраў і новабудоўляў.

Па карце атласа (с. 34) знайдзіце адміністрацыйныя раёны з дадатным сальда міграцыі сельскага насельніцтва, а таксама гарады з дадатным сальда міграцыі больш за 10/1000 чал.

Знешняя міграцыя, якая ўключае эміграцыю і іміграцыю, таксама істотна адрознівалася на працягу XX ст. Эміграцыя насельніцтва ў першай палове стагоддзя была выклікана палітычнымі падзеямі (войны, рэвалюцыя і г. д.). У канцы XX ст. на першы план выйшлі эканамічныя і экалагічныя прычыны: распад СССР, эканамічны крызіс, вывад вайсковых частак у Расію, аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

Працэсы іміграцыі таксама мелі розную інтэнсіўнасць на працягу XX ст. Яны спрыялі агульнаму росту колькасці насельніцтва краіны. У час пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі ў Беларусь прыбыло шмат спецыялістаў з рэспублік СССР. Вялікая колькасць імігрантаў з краін СНД і Балтыі прыпала на пачатак 1990-х гг. Галоўнымі прычынамі іміграцыі асоб беларускай і іншых нацыянальнасцей (так званая вымушаная іміграцыя) былі жаданне вярнуцца на радзіму, а таксама неабходнасць пакінуць зоны канфліктаў. Працоўная іміграцыя прадстаўлена асобамі, занятымі ў сферы паслуг, радзей — у прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Розніца паміж асобамі, якія прыбылі ў краіну, і асобамі, якія выбылі, складае сальда знешняй міграцыі, якое можа быць альбо дадатным, альбо адмоўным. Цяпер у краіне назіраецца дадатнае сальда знешняй міграцыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 2. Этнічны склад насельніцтва.

Размяшчэнне Беларусі ў цэнтры Еўропы абумовіла пражыванне на яе тэрыторыі розных народаў. Гэта спрыяла фарміраванню асаблівага этнакультурнага асяроддзя, заснаванага на верацярпімасці, павазе да звычаяў іншых народаў.

Па даных перапісу 2019 г., у краіне пражываюць прадстаўнікі больш як 130 нацый і народнасцей (мал. 84). Беларусы складаюць аснову насельніцтва — 84,9 %. Найбольшая доля беларусаў у Мінскай вобласці, найменшая — у Гродзенскай. Большасць з іх роднай лічаць беларускую мову, якая мае розныя дыялекты.

Чым тлумачыцца фарміраванне дыялектаў у Беларусі?

З дапамогай карты атласа (с. 35) растлумачце тэрытарыяльныя адрозненні ў размеркаванні этнасаў.

Другім па колькасці этнасам у Беларусі з'яўляюцца рускія, доля якіх складае 7,5 %. Рускія пражываюць пераважна ў буйных гарадах з прамысловымі прадпрыемствамі, якія вызначалі спецыялізацыю Беларусі ў гаспадарчым комплексе СССР. У Віцебскай вобласці доля рускіх складае больш за 10 % насельніцтва, амаль 8 % іх і ў г. Мінску. Уздоўж беларуска-літоўскай і беларуска-польскай мяжы кампактнай групай пражываюць палякі, якія займаюць трэцяе месца ў краіне — 3,1 %. На паўднёвым захадзе краіны і ўздоўж беларуска-ўкраінскай мяжы пражываюць украінцы, доля якіх, як правіла, не перавышае 5 % ад насельніцтва раёна, а па краіне складае 1,7 %. Яўрэі гістарычна пражываюць у асноўным у гарадах. У некаторых раёнах Гродзенскай вобласці сустракаюцца кампактныя групы з літоўскім насельніцтвам. За першыя дзесяцігоддзі XXI ст. значна вырасла колькасць армян, кітайцаў, туркменаў, якія пастаянна пражываюць у Беларусі.




Мал. 84. Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі, % (па перапісе 2019 г.)

У наваколлі буйных гарадоў сустракаюцца паселішчы цыган (в. Калодзішчы каля Мінска, раён Цітоўка на ўскраіне Бабруйска і інш.). У асобных раёнах Мінскай і Гродзенскай абласцей утварыліся гістарычныя арэалы пражывання татараў. Чаму на тэрыторыі Беларусі сфарміраваліся цыганскія і татарскія паселішчы?

**3. Рэлігійны склад насельніцтва.** Наяўнасць розных этнасаў і гісторыя фарміравання краіны абумовілі поліканфесійную структуру грамадства. На тэрыторыі Беларусі зарэгістраваны 25 рэлігійных канфесій. На фарміраванне беларускай культуры, якая адносіцца да агульнаславянскага тыпу, вялікі ўплыў зрабіла хрысціянства. Па колькасці вернікаў асноўнымі з'яўляюцца праваслаўнае хрысціянства і рымска-каталіцкае хрысціянства. Значную долю складаюць пратэстанты. У многіх раёнах цэнтральнай часткі Палесся і на ўсходзе краіны колькасць пратэстанцкіх суполак перавышае колькасць рымска-каталіцкіх, а ў некаторых раёнах — і праваслаўных. Таксама існуюць мусульманскія і іўдзейскія суполкі.

У краіне функцыянуе каля 20 духоўных навучальных устаноў розных канфесій.

Па карце атласа (с. 36) прааналізуйце размяшчэнне суполак розных канфесій.

Дзяржава надае ўвагу пытанням дзейнасці рэлігійных арганізацый. Аднаўляюцца цэрквы і касцёлы, манастыры.

Вядомыя далёка за межамі краіны Сафійскі сабор у Полацку, Каложская царква ў Гродне, касцёл Божага цела ў Нясвіжы, Свята-Духаў кафедральны сабор у Мінску і інш.

На карце атласа (с. 37) знайдзіце найбольш вядомыя храмы Беларусі.

Большасць рымска-каталіцкіх рэлігійных устаноў знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці. У Мядзельскім раёне ў аг. Будслаў штогод праходзяць урачыстасці ў гонар абраза Будслаўскай Божай Маці на тэрыторыі рымска-каталіцкай парафіі Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі (мал. 85).

У 2018 г. ЮНЕСКА ўключыла фестываль у аг. Будслаў у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 85. Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў аг. Будслаў

**Падвядзём вынікі.** Беларусы складаюць асноўную частку насельніцтва ў этнічнай структуры. Асноўныя канфесіі — праваслаўнае і рымска-каталіцкае хрысціянства.

***Праверце сябе.*** 1. На якія віды падзяляецца міграцыя? 2. Якія этнасы пераважаюць у структуры нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі? 3. Назавіце канфесіі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якія змены адбыліся ў напрамках міграцыйных патокаў на пачатку XXI ст.? 2. Да якіх дэмаграфічных наступстваў можа прывесці міграцыя з сельскай мясцовасці ў горад?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Падрыхтуйце матэрыял для краязнаўчага кутка па размяшчэнні храмаў на тэрыторыі вашага раёна.

## § 25. Гарадское і сельскае насельніцтва

***Успомніце.*** *Якія тыпы паселішчаў існуюць у свеце? Што такое ўрбанізацыя?*

**1. Гарадское і сельскае насельніцтва.** У Беларусі колькасць гарадскіх жыхароў і іх доля ў агульнай колькасці насельніцтва пастаянна павялічваецца, што адпавядае сусветнай тэндэнцыі ўрбанізацыі. Індустрыялізацыя, навукова-тэхнічны прагрэс, рост адукацыйнага і культурнага ўзроўню